# МОВА Ў КАНТЭКСЦЕ ФЭНТЭЗІ

*Ісаковіч М.У.*

*Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт інфарматыкі і радыёэлектронікі*
*г. Мінск, Рэспубліка Беларусь*

*Дапіра Т.П. – ст. выкладчык*

Разглядаецца роля мовы ў стварэнні фэнтэйнага сюжэта на прыкладзе рамана Станіславы Умец “Сэрца Сакры”. Аналізуюцца характэрныя рысы стварэння выдуманага свету ў творах жанру фэнтэзі ў аспекце мовы.

На рубяжы XX-XXI стагоддзяў тэмп жыцця грамадства значна паскорыўся. Праблема пастаяннай схільнасці да стрэсу і інфармацыйнае перанасычэнне ўсё часцей адлюстроўваецца на здароўі грамадзян [1]. Павышэнне агульнакультурных і прафесійных патрабаванняў грамадства да асобы выклікае неабходнасць у яе штодзённай самаадукацыі і самаразвіцці. Чалавек можа выканаць гэтыя задачы толькі пры эфектыўным выкарыстанні асабістага вольнага часу. Пры гэтым значная частка такога часу не павінна быць толькі рацыяналізаванай, а трэба іншы раз адысці ад планавання, развіцця інтэлекту, ацэнкі якасці выкарыстання незанятых працай гадзін. Трэба, каб вольны час “ахоўваў, аздараўляў душу чалавека”, свядома адводзіў асобу ад праблем надзённасці ў сферу прыгажосці, адпачынку, творчасці, мар [2, с. 210].

Як знайсці тую сцяжынку, якая дапаможа адысці ад хібаў сучаснага грамадства і пабыць сам-насам са сваімі думкамі? Тут на дапамогу прыходзіць эзатэрыка – фэнтэзі. Гэты жанр літаратуры дае магчымасць адчуць свабоду ўяўлення, пагрузіцца ў дзіўны і чароўны сусвет, дзе існуюць магія, героі, эпічныя прыгоды. І менавіта мова адыгрывае ключавую ролю ў стварэнні гэтага нерэальнага сусвету. Яна становіцца адным з самых каштоўных сродкаў, з дапамогай якога мастакі перадаюць свае ідэі і ўвасабляюць у жыццё дзівосныя сюжэты.

Фэнтэзійныя элементы прысутнічалі ў беларускай культуры яшчэ з даўніх часоў, бо згаданы жанр цесна звязаны з фальклорам і міфалогіяй. Для апісання выдуманага свету, стварэння незвычайных персанажаў і перадачы магічнай атмасферы не дастаткова класічнай мовы, трэба прыцягваць увагу чытача чымсьці унікальным, дагэтуль яшчэ неіснуючым. Аўтары твораў у жанры фэнтэзі якраз і ствараюць такі неверагодны сюжэт.

Станіслава Умец – маладая беларуская пісьменніца, якая робіць першыя крокі ў вялікі свет літаратуры. У яе рамане “Сэрца Сакры” якраз і адлюстроўваюцца жанравызначальныя,ключавыя асаблівасці мовы для напісання твораў фэнтэзі.

Характэрнай рысай вышэйзгаданага жанру з’яўляецца аздабленне мовы словамі, якія надаюць незвычайную жывапіснасць тэксту. Пры напісанні твора аўтар часта эксперыментуе з сінтаксічнымі канструкцыямі і структурай сказаў, каб стварыць нязвыклыя і нестандартныя формы выказвання [3]. Архаічная лексіка, своеасаблівыя тэрміны ці выдуманыя словы становяцца сродкам адлюстравання надрэальнасці. Мова ў кантэксце фэнтэзі стварае дысанансы і супярэчнасці ў творы, што выклікае адчуванне неправўдападобнасці.

У рамане С. Умец яскравымі прыкладамі стварыла свой асабісты сусвет, дзе галоўны герой можа не мець уяўленняў пра тэорыю і рытуалы, але пры гэтым вельмі проста працаваць з магічным матэрыялам на ўзроўні інстынкту, скіроўваючы яго так, як яму трэба. *“Дзяўчынка выцягнула з заплечніка чорны фламастар і рупліва намалявала дзверы... Калі яна схавала фламастар, пачуўся непрыемны гук рэзання металу – і дзверы ажылі”* [4, с.100]. У “Сэрцы Сакры” крыніцай магіі з’яўляюцца рэчы і прадметы. *“Самацветы – самыя моцныя магічныя рэчы ва ўсёй Сакры, настолькі моцныя, што дзейнічаюць і на Зямлі”* [4, с. 63]. Гэты камень надзяляе ўладальніцу надзвычайнымі здольнасцямі. Так, пры дапамозе самацвету галоўныя гераіні могуць тварыць цуды. *“І тут адбылося тое, чаго яна (Кася) ніяк не чакала: чалавечак выскачыў з аркуша і пакрочыў”* [4, с. 65]. *“Кася дакранулася да яе (сцяны) – і перашкода адразу знікла”* [4, с. 156]. Аднак самым яркім прыкладам адлюстравання эзатэрыкі мовы ў творы з’яўляецца наяўнасць выдуманых словаў, напрыклад, *сакравічкі, цувыры, Сакра і іншыя.*

Як бачым, у фэнтэзі, эзатэрыка выступае важным элементам, які садзейнічае глыбокаму разуменню магічнай прыроды свету і магчымасці пранікнення за межы штодзённай рэальнасці. У такім кантэксце, мова адыгрывае ролю ключавога інструмента для перадачы і ўзаемадзеяння з магічнымі сіламі. Мова фэнтэзі нібы накіроўвае нашу свядомасць у іншы сусвет, і кожная такая чароўная гісторыя выконвае найбольш актуальныя на сённяшні момант задачы, якія стаяць перад аўтарам твораў у гэтым жанры: аднаўленне душэўнай раўнавагі, забеспячэнне ўцёкаў ад рэчаіснасці і стварэнне казачнага шчаслівага фіналу.

**Спіс выкарыстаных крыніц:**

1. Стресс – "чума" 21 века [Электронны рэсурс]. – Рэжым доступу: https://dzhmao.ru/info/articles/stress-chuma-21-veka/ – Дата доступу: 27.03.2024.
2. Михайлова, Л.И. Социалогия культуры: Учебное пособие / Л.И.Михайлова. – М.: ФАИР-ПРЕСС, 1999. – 232 с.
3. Шамякина, С.В. Литература фэнтези: дифференциация понятия и жанровая характеристика: учеб.-метод. пособие / С.В.Шамякина – Мінск: БДУ, 2023. – 16 с.: Учебное электронное издание [Электронны рэсурс]. – Рэжым доступу: https://bsu.by/upload/pdf/209023.pdf – Дата доступу: 27.03.2024
4. Умец, С.В. Сэрца Сакры / С.В.Умец. – Мінск: Мастацкая літаратура, 2018. – 224 с.